**Яўдошына Л.І.**
Летняя сесія 2019/2020 н.г.

Установа адукацыі “Брэсцкі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна”
Кафедра беларускай філалогіі

ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ
па курсе **“Гістарычная граматыка беларускай мовы”**
для спецыяльнасці “**Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)”, 2 курс**

1. Прадмет і задачы курса гістарычнай граматыкі. Месца і значэнне гістарычнай граматыкі ў сістэме філалагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў па роднай мове і літаратуры.
2. Гістарычныя ўмовы ўтварэння і асаблівасці развіцця беларускай мовы, яе месца сярод славянскіх моў.
3. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы. Агляд найбольш каштоўных помнікаў старабеларускага пісьменства.
4. Графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства.
5. Сістэма вакалізму агульнаўсходнеславянскай мовы.
6. Сістэма кансанантызму агульнаўсходнеславянскай мовы.
7. Структура склада ў агульнаўсходнеславянскай мове: прынцып нарастаючай гучнасці, адсутнасць закрытых складоў, складовы сінгарманізм. Адметнасць старажытнага славянскага націску.
8. Пераходнае памякчэнне заднеязычных у суседстве з галоснымі пярэдняга рада (першая, другая і трэцяя палаталізацыі), яго вынікі ў сучаснай беларускай мове.
9. Асаблівасці спалучэння зычных і груп зычных з [**j**] (ётам) і яго вынікі ў сучаснай беларускай мове.
10. Змяненне пачатковых спалучэнняў **орт** (***ort**), **олт** (***olt**) і яго вынікі ў сучаснай беларускай мове.
11. Канчатковае афармленне спалучэнняў **torot**, **teret**, **tolot**, **telot** (першае поўнагалоссе). Гіпотэзы адносна яго паходжання.
12. Насавыя галосныя і іх гісторыя. Гістарычныя чаргаванні, звязаныя з дэназалізацыяй насавых галосных.
13. Лёс рэдукаваных [**ъ**], [**ь**]. Вынікі страты рэдукаваных у вакалізме: бегласць галосных, прыстаўныя і ўстаўныя галосныя, падаўжэнне галосных.
14. Змяненне рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у спалучэнні з плаўнымі. Чаргаванне **ро:ры**, **ло:лы**, **ле:лі**. Другое поўнагалоссе.
15. Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у кансанантызме: асіміляцыйныя і дысіміляцыйныя змяненні зычных у новых групах зычных, зацвярдзенне губных на канцы слова і перад зычнымі, змяненне звонкіх зычных на канцы слова.
16. Спрашчэнне груп зычных. Страта канцавога [**л**].
17. Зычныя [**г**], [**ф**] у кансанантызме беларускай мове. Зацвярдзенне [**р**]; своеасаблівае памякчэнне [**д**], [**т**] у беларускай мове.
18. Зацвярдзенне шыпячых і [**ц**] у беларускай мове. Развіццё афрыкаты [**дж**].

19. Развіццё падоўжаных і падвоеных зычных.
20. Развіццё прыстаўных зычных. Зычны **г.** Змяненне **гы→гі**, **кы→кі**, **хы→хі**.
21. Гісторыя [**ў**] (у нескладовага). Умовы з'яўлення [**ў**] на месцы [**в**], [**л**]. Пераход [**л**] у [**ў**] паводле граматычнай аналогіі.
22. Гісторыя акання. Гіпотэзы адносна прычын і часу ўзнікнення акання. Адлюстраванне акання ў помніках пісьменства.
23. Пераходнае памякчэнне спалучэнняў заднеязычных з зубнымі зычнымі [**гт**], [**кт**] **(*gt, *kt)** перад галоснымі [**ь**], [**и**]. Змяненне спалучэнняў [**гв**], [**кв**] **(*gv, *kv)** перад [**ě**] з дыфтонга ***oi**.
24. Змяненне галоснага **ѣ**. Змяненне **э** (**е**) на **о** (**ё**). Страта канцавых галосных і [**j**].
25. Рэдукаваныя **ы**, **і** (напружаныя **ъ**, **ь**) і іх лёс.
26. Сістэма часцін мовы, гісторыя яе фарміравання. Змены ў марфалагічнай будове слоў. З'явы аналогіі, спрошчання, перараскладання.
27. Назоўнік, яго граматычныя катэгорыі (род, лік, склон). Рэшткі парнага ліку ў сучаснай беларускай мове.
28. Старажытныя тыпы скланення назоўнікаў. Паняцце пра прадуктыўныя і непрадуктыўныя тыпы скланення. Старажытныя асновы назоўнікаў.
29. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***ā** (***jā**), яго ўплыў на другія тыпы скланення. Рэлікты старажытных тыпаў скланення ў сучасным першым скланенні.
30. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***ŏ** (***jŏ**), яго ўплыў на другія тыпы скланення. Рэлікты старажытных тыпаў скланення ў сучасным другім скланенні.
31. Змены ў скланенні на ***ĭ**, рэлікты некаторых яго склонавых форм у скланенні назоўнікаў сучасных тыпаў скланення.
32. Страта старажытнага скланення на ***ŭ** як асобнага тыпу і рэлікты некаторых яго склонавых форм у скланенні назоўнікаў сучасных тыпаў скланення.
33. Лёс старажытнай сістэмы скланення назоўнікаў. Сучасная тыпалогія скланення назоўнікаў і яе адносіны да старажытных тыпаў іменнага скланення.
34. Скланенне асабовых і зваротнага займеннікаў. Суплетывізм асноў асабовых займеннікаў.
35. Гісторыя склонавых формаў неасабовых займеннікаў.
36. Гісторыя займенніка 3-й асобы. Змены ў склонавых канчатках.
37. Скланенне іменных прыметнікаў у старажытнасці. Выпадкі ўжывання іменных формаў якасных прыметнікаў у сучаснай беларускай мове.
38. Гісторыя формаў параўнання прыметнікаў. Развіццё аналітычных формаў ступеней параўнання прыметнікаў і асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове.
39. Гісторыя займенных прыметнікаў. Сцягнутыя (злітныя) формы прыметнікаў. Прыналежныя прыметнікі.
40. Фарміраванне лічэбніка як часціны мовы. Граматычныя змены ў простых лічэбніках.
41. Парадкавыя, зборныя і дробавыя лічэбнікі.
42. Складаныя і састаўныя лічэбнікі: гісторыя ўтварэння, граматычныя змены.
43. Граматычныя катэгорыі і формы дзеяслова ў старажытнай мове.
44. Нязменныя формы дзеяслова: інфінітыў, супін.
45. Нетэматычнае спражэнне ў гісторыі беларускай мовы. Змяненні ў формах цяперашняга часу.
46. Гісторыя формаў будучага часу дзеяслова.

47. Гісторыя тэматычнага спражэння. Зліццё тэматычных галосных з асабовымі канчаткамі і формаўтваральнымі суфіксамі. Змяненні ў формах цяперашняга часу.
48. Гісторыя формаў прошлага часу дзеяслова.
49. Гісторыя формаў ірэальных ладоў дзеяслова: загаднага і ўмоўнага.
50. Гісторыя формаў дзеепрыметніка. Паходжанне дзеепрыслоўяў.
51. Агульная характарыстыка прыслоўяў. Першасныя займеннікавыя прыслоўі і іх лёс.
52. Утварэнне другасных прыслоўяў.
53. Службовыя словы ў гісторыі беларускай мовы.
54. Гістарычныя змены сінтаксічных сувязей і сродкаў іх выражэння.

Літаратура


1. Янкоўскі, Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / Ф.М. Янкоўскі. – 3-е выд., выпр. – Мінск : Выш. школа, 1989.

2. Булыка, А.М. Гістарычная марфалогія беларускай мовы / А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, І.І. Крамко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979.

3. Сацута, І.У. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Заданні і метадычныя парады да кантрольнай працы / І.У. Сацута. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2008.

4. Анічэнка, У.В. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Зборнік практыкаванняў / У.В. Анічэнка, М.Р. Прыгодзіч. – Мінск : Універсітэцкае, 2001.

5. Яскевіч, А.А. Старабеларускія граматыкі : да праблемы агульнафілал. цэласнасці / А.А. Яскевіч. – Мінск : Бел. навука, 1996.

6. Беларуская мова : энцыклапедыя ; пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск : БелЭн, 1994.

7. Янович, Е.И. Историческая грамматика русского языка : [Учеб. пособ. для филол. фак. вузов] / Е.И. Янович. – Минск : изд-во “Университетское”, 1986.

8. Трофимович, Т.Г. Историческая грамматика русского языка : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений по филол. спец. / Т.Г. Трофимович. – Минск : ТетраСистемс, 2011.

9. Королевич, С.А. История общевосточнославянского языка. Учеб. пособие для студ. филол. спец. высш. учебных заведений / С.А. Королевич. – Брест : БрГУ, 1998.